# Журналістыка

В. І. ДУБОВІК

## РАЁННАЯ ГАЗЕТА Ў СІСТЭМЕ ПЕРАБУДОВЫ

Перабудова патрэбавала ад раённых газет самых радыкальных мер. Па-першае, рашуча, без аглядкі на «начальства», але і без пагоні за «печанымі фактамі», без цягі да сенсацыйнасці, вырвацца з вузкага кола традыцыйна лідзіруючых тэм, якія нязменна задаваліся з кампаніі ў кампанію і ўзмоцнена ўкараняліся на святы. Ад гэтага часу цікавіцца літаральна ўсім, чым поўна жыццё, усімі ўчасткамі і ўсімі бакамі рэчаіснасці, не выключаючы і так званыя «закрытыя тэмы», «далікатныя пытанні», «канфліктныя сітуацыі». І пісаць не аб усім пакрысе, як раней, а аб самым галоўным на кожным этапе (у наш час — гэта праблемы і пазітыўныя вынікі эканамічнай рэформы і дэмакратызацыі грамадства). У рамках вытворчай тэматыкі, якая павінна быць у цэнтры ўвагі, у першую чаргу заняцца збіраннем, разборам і папулярызацыяй мясцовага вопыту, выражаючы яго сутнасць: як, якім чынам дасягнуты поспех, як і дзе яго можна выкарыстаць з найбольшай эфектыўнасцю, раскрываючы карыснасць, мэтазгоднасць, прымянімасць яго ў даным месцы, з улікам эканамічных і геаграфічных асаблівасцей, не збіваючыся пры гэтым на чыстую «тэхналогію», а робячы акцэнт на жывым чалавеку, яго адносінах да справы; пераглядзець арганізацыю і паказ спаборніцтва ў самых разнастайных формах: звароты калектываў, адкрытыя пісьмы рабочых і калгаснікаў, вытворчыя пераклічкі, «буксіры», узаемныя праверкі (галоўны арбітр — рэдакцыя!) — усё павінна быць дзелавіта, салідна і канкрэтна, без агульных заклікаў, трафарэтных абавязацельстваў.

Па-другое, назаўсёды пакончыць з парадкасцю і рапартаманіяй, якія старанна культывіраваліся доўгія гады і пры якіх працвіталі прывычка маніпуліраваць статыстыкай, яўная прадузятасць і суб'ектывізм ацэнкі, эйфарыя захвальвання ледзь прыметнага зруху і стараннага запалу хутчэй далажыць, зрабіць справаздачу, работа на знешні эфект, уяўны дабрабыт, што ўрэшце абярнулася распаўсюджаннем ілжэспаборніцтва з яго нябачнымі «сапернікамі», дутымі «пераможцамі», штучнымі «маякамі», разгулам «пачынатворчасці» з яе фальшывым пафасам, залішнімі захапленнямі і іншай небыліцай і вольнасцямі, якія імітуюць народную ініцыятыву, засіллем «забароненых зон» для крытыкі, а з імі — і «недатыкальных» вялікіх і малых «правадыроў», скрываннем злачынстваў, памылак і няўмення — усім тым, што цяпер называецца прыпіскамі, лакіроўкай і паказухай. Зрабіць фактычную праўду сваім арганічным законам, а крытыку, што называецца, нягледзячы на асобы,— больш прынцыповай, абгрунтаванай і канструктыўнай, з такім разлікам, каб яна не стала паклёпніцкай, «разноснай», якая развенчвае ўсё і ўся.

Па-трэцяе, поўнасцю вызваліцца ад панаваўшага ўсе гэтыя гады

схематызму,— калі жыццёвыя з'явы, складаныя чалавечыя адносіны і інш. адлюстроўваліся мімаходзь і аднастайна, у спрошчана-абагульненым выглядзе, у агульных рысах, ці накшталт разжаванай кашкі: скрозь — лічбы і прозвішчы, пералік мерапрыемстваў і ўзнагарод, без якой-небудзь спробы асэнсаваць, параўнаць і супаставіць іх; калі сучасныя героі характарызаваліся прыкладна па такому плану: закончыў школу — пайшоў на работу — палюбіў сваю прафесію — дасягнуў якога-небудзь паказчыка — узяў павышанае абавязацельства,— замест таго, каб разгледзець канкрэтную асобу ў адзінстве яе дзелавых і маральных якасцей. Больш смела пераходзіць ад інфармацыйна-канстатуючага, павярхоўнага апісальніцтва да глыбокай аналітычнасці і праблемнасці, ад павучальнасці і асветніцтва — да сур'ёзнага роздуму і пераканання, ад аб'яшчэння так званых «ісцін у апошняй інстанцыі», ад дэкларавання пастулатаў і вывадаў — да раўнапраўнага і карэктнага дыялогу, калі сутыкаюцца самыя розныя пункты гледжання, думкі і падыходы, але дыскусія не суправаджаецца нетактоўнасцямі і зневажаннямі, падобнымі на лаянку, палеміка не падмяняецца сваркай, а крытыка меркаванняў — крытыкай асоб, калі спрэчка вядзецца не з дапамогай ярлыкоў, а з дапамогай аргументаў. Гэта дае магчымасць больш аб'ектыўна і важка вызначыць сапраўднае становішча спраў, паказаць прычыны пралікаў і упушчэнняў, указаць шляхі ліквідацыі іх, больш поўна ўскрыць рэзервы; гэта паскарае працэс перакананасці таварышаў, якія памыляюцца, дапамагае ім зрабіць правільны выбар.

Па-чацвёртае, цалкам пазбавіцца ад казённага, канцылярскага стылю, калі нават цудоўныя думкі выказваюцца «сцёртымі», «збітымі» словамі, стэрэатыпнымі выразамі і гатовымі акадэмічнымі формуламі. «Раскаваць» мову публікацый, якія напамінаюць дакладныя, даведкі, справаздачы, змяніць тон, манеру апавядання: адмовіцца ад катэгарычных «павінны», «абавязаны», «закліканы» і да т. п. і старацца раіцца з чытачом; разнастаіць жанры: ад малых форм, ад заметкі, замалёўкі, карэспандэнцыі пераходзіць да вялікіх — артыкула, агляду, нарыса і г. д. Часцей даваць пісьмы чытачоў, не баючыся друкаваць іх без «стэрылізацыі», не выпраўляючы што-небудзь, акрамя граматычных памылак,— толькі б захаваць аўтарскія фарбы і не сапсаваць жыва напісаную рэч.

Па-пятае, зжыць з практыкі папросту бытуючыя ў нас фармальныя прыёмы работы з поштай чытачоў, з рабселькорамі і аўтарскім актывам, а таксама ўсталяванае ў звычаях многіх рэдакцый і ствараючае ілюзію масавага ўдзелу ў газеце працоўных ашуканства ад журналістыкі,— калі рэдакцыйны работнік, узяўшы з пісьма ці па тэлефоне некалькі трапіўшых пад руку лічбаў і прозвішчаў, «арганізуе» карэспандэнцыю няштатніка, аб змесце якой той даведваецца ўжо з газеты; калі рэдработнік піша артыкул партыйнага ці дзяржаўнага дзеяча — дыктуе культ пасады! — ад пачатку да канца; калі «рэдраб», які праводзіць рэйд, шукае ахвотнікаў «увайсці» — маўляў, для саліднасці! — у «брыгаду» ўжо пасля таго, як матэрыял гатовы; калі і нядрэнны рукапіс — быццам для карысці справы! — дапрацоўваецца (устаўляюцца велізарныя чужыя кавалкі) ці адшліфоўваецца (учыняецца «густавая» праўка) так, што аўтарства публікацыі можна ўстанавіць толькі па подпісу; калі пісьмы-скаргі, на паток якіх наракаюць газетчыкі, спасцігае яшчэ больш сумны лёс: яны ці здаюцца ў архіў, ці трапляюць да таго, на каго скардзяцца (вось якая магія кіруючага паста!). Каб не ўпусціць ніводнага чалавека, здольнага і жадаючага супрацоўнічаць у газеце, каб ні адзін актывіст не «згубіўся», няхай кожны адчуе ўвагу да сябе рэдакцыі: хто — праз «Школу (універсітэт) маладога карэспандэнта» (з лекцыямі і «вечарамі пытанняў і адказаў», з аналізам рукапісаў, з конкурсамі на пэўныя тэмы, з сустрэчамі з кіраўнікамі горада і раёна, з экскурсіямі, выездамі ў іншыя рэдакцыі), хто — праз «Клуб цікавых сустрэч», дзе абмяркоўваюцца розныя журналісцкія праблемы, хто — праз вытворчыя фарміраванні на грамадскіх пачатках (няштатныя аддзелы,

саветы), хто — праз нарады, сходы ці «вечары адпачынку» рэдкалектыву, а хто — і па тэлефоне ці асабіста ў час камандзіровак; няхай ніводнага пісьма не застанецца без уліку, без кантролю, без адказу і — галоўнае! — без рэагавання.

Па-шостае, не спадзеючыся на «указанні зверху», як гэта было раней, у нядобрыя, застойныя часы, але і, зразумела, не адмаўляючыся ад дапамогі, садзейнічання дырэктыўных органаў, нястомна дабівацца абавязковай і найбольшай выніковасці сваіх выступленняў — як негатыўна-выкрываючых, так і пазітыўна-сцвярджаючых, а асабліва — прапагандуючых вопыт работы наватараў вытворчасці і пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва. Мала таго — мужна змагацца за тое, каб кожнае з іх пакінула які-небудзь след, не спыняцца пры гэтым на паўшляху, не задавальняцца паўмерамі, не пасаваць ні перад «абвяргальнікамі», ні перад «заціскальнікамі», ні перад праследвальнікамі па суду, тым больш, што ў нас будзе Закон аб друку, які дакладна акрэсліць не толькі абавязкі журналіста, але і яго правы, гарантуе надзейную абарону ад самавольства і несправядлівасці.

Такія крутыя меры па ўдасканаленню раённага друку, натуральна, выклікалі неабходнасць рэзкага ўзмацнення патрабавальнасці да яго работнікаў. Яна фармулюецца цяпер так: слабае веданне справы, недобрасумленнае выкананне службовых абавязкаў, недастатковая адказнасць за свае ўчынкі не толькі прыніжаюць аўтарытэт журналістаў у вачах грамадскасці, але фактычна наносяць удар па публічнасці і дэмакратыі, што, зразумела, зусім недапушчальна.

Усё гэта, у сваю чаргу, пабудзіла райкомы партыі па-новаму паглядзець на стыль і метады кіраўніцтва мясцовым друкам, прадставіўшы яго ў святле перабудовы, ацаніць, наколькі яно пастаяннае і паслядоўнае, канкрэтнае і кампетэнтнае, прынцыповае і мэтанакіраванае. Тут ва ўвесь рост паўсталі такія праблемы: 1) вывучэнне газетных камплектаў, старонак і асобных публікацый, іх зместу, літаратурных і паліграфічных вартасцей і недахопаў, іх дзейснасці і эфектыўнасці; 2) вывучэнне чытацкай аўдыторыі, яе агульнай, палітычнай і прафесіянальнай структуры, узроўню яе адукацыі, культуры, яе меркаванняў аб тых ці іншых рубрыках, серыях, цыклах, яе жаданняў, чаканняў і да т. п.; 3) вывучэнне рэдакцыйнай пошты, а таксама сацыяльна-дэмаграфічнага складу, ступені падрыхтаванасці аўтараў пісьмаў, іх мэт і матываў карэспандзіравання; 4) вывучэнне саміх журналістаў, іх агульнасацыяльных, ідэйна-маральных і творчых характарыстык, стану падбору і расстаноўкі — і іншыя праблемы, якія даўно чакаюць свайго навуковага даследавання ў непарыўнай сувязі з дзейнасцю ўсіх іншых каналаў журналістыкі, ва ўзаемаадносінах з мясцовымі ідэалагічнымі арганізацыямі і ўстановамі партыі. Тут жа на парадак дня, натуральна, сталі і такія пытанні: 1) аб метадах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў і павышэння прэстыжнасці іх працы; 2) аб формах масавай работы газет з чытачамі, грамадскімі карэспандэнтамі і шляхах папаўнення аўтарскага актыву; 3) аб мерах па забеспячэнню рэдакцый і друкарняў матэрыяльна-тэхнічнай базай, транспартам, жыллём для супрацоўнікаў — і іншыя пытанні, якія ствараюць адзіны комплекс з вышэйпералічанай праблематыкай. Гэтыя і іншыя традыцыйныя праблемы і пытанні, дзякуючы перабудове, загучалі асабліва своечасова, набылі дадатковую вастрыню.

У мэтах іх вырашэння за апошнія год-два быў прадпрынят рад неадкладных дзеянняў. Перш за ўсё паўсюдна праводзяцца канкрэтна-сацыялагічныя апытанні чытачоў, якія маюць сваёй задачай вызначыць удзельную вагу «раёнак» сярод іншых звенняў масавай камунікацыі, што насычаюць аўдыторыю «сваёй» інфармацыяй, а таксама даць газетчыкам усе звесткі аб іх «субяседніку»; апрабоўваецца і ўкараняецца ў дзейнасць рэдакцый навуковая сістэма ўліку аўтараў і аналізу рэдпошты; правяраецца і ўдасканальваецца практыка інфармавання журналістаў партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі органамі,— з тым, каб

прэсканферэнцыі сталі рэгулярнымі, больш прадстаўнічымі і павучальнымі; у райкомах і абкомах ствараюцца групы і ўмацоўваецца састаў рэцэнзентаў, якія перыядычна рыхтуюць агляды газеты. Работнікі партыйнага камітэта ўжо не смеюць камандаваць, дзе які матэрыял змяшчаць і колькі адводзіць яму месца, ужо не сустракаюць у штыкі кожную спробу журналістаў зрабіць інакш, ужо не злоўжываюць паспешнымі, раптоўнымі спагнаннямі і «аргвывадамі», а асноўную стаўку робяць на вучобу і выхаванне, на нефармальныя зносіны,— калі звычайным становіцца такі зварот: «Падумайце, таварышы, чым тут дапамагчы зможаце».

Разам з тым многае яшчэ не зроблена або недароблена. І, калі ўзяць гэтыя газеты ў даны момант, дык, па вялікаму рахунку, можна заявіць, што перабудоўваюцца яны на новы лад вельмі марудна. На іх старонках слаба адлюстроўваюцца новыя формы арганізацыі ў аграпрамкомплексе: праблемы гасразліку, калектыўнага, сямейнага і арэнднага падраду. Пры вядзенні вытворчай прапаганды яны абмяжоўваюцца публікацыяй грувасткіх і расплыўчатых матэрыялаў, асноўная бяда якіх — шматпланавасць (у выступленне ўціскаецца некалькі самастойных тэм) і эканамічная бездапаможнасць дарэмная дэталізацыя пры абагульненні перадавога вопыту, «утлумачванне» прапісных ісцін, накшталт таго, што трэба ўгнойваць глебу і знішчаць пустазелле, сеяць трэба своечасова і кандыцыйным гатунковым насеннем, найбольшую прывагу забяспечвае паўнацэннае кармленне); да таго ж дапускаецца валявы падыход, калі рэкамендацыі даюцца агульныя для ўсіх гаспадарак, без уліку мясцовых магчымасцей і ўмоў. Як і раней, яны празмерна тэхналагічныя: ім не хапае палітычнай завостранасці, сістэматычнага і творчага падкрэслівання ўзаемасувязі гаспадарчай дзейнасці і выхавання, эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу; з іх поля зроку знікае чалавек з яго перажываннямі, імкненнямі і клопатамі, а разам і яго сацыяльна-бытавое становішча. Яны быццам не заўважаюць, што на месцах прыніжана роля пярвічных партарганізацый і партгруп, спецыялістаў-аграрнікаў і кіраўнікоў сярэдняга звяна, што спаборніцтва і эканамічная вучоба калгаснікаў і рабочых праходзяць фармальна. «Услаўляючыя рупары», курыўшыя фіміям у мінулым, яны пяюць дыфірамбы, хвалебныя гімны засядальніцкай мітусні, рознай шумісе і «заарганізаванасці» і зараз; крытыка, калі і раздаецца нарэшце, дык «безадрасная», нястрогая, паблажлівая, накшталт шпілечнага ўколу. Пратрубіўшы раз-другі аб якім-небудзь «пачыне», які, чаго скрываць, часам нараджаецца... у самой рэдакцыі, прагнучай пахваліцца, што яна не дрэмле, яны тут жа забываюць аб ім. Амаль што самым вялікім «грэхам» яны лічаць прапусціць хоць адну вытворчую зводку, і ў іншых нумарах публікуюць да дзесятка розных табліц, якія «забіраюць» добрую палавіну наяўнай плошчы. Размаўляюць яны па-ранейшаму безапеляцыйнай, «дырэктыўнай» мовай; кампазіцыя твораў стандартная; у вёрстцы многа ўсім надакучыўшага шаблону, спрацаванага па адной «калодцы»; шэрасць, быццам павуцінне, ахутвае газетны ліст. І атрымліваецца не жывапісанне, а мёртвая схема, не друкаванае выданне са сваёй цудоўнай эстэтычнасцю, а друкаваны плакат аб чатырох палосах са смутным выглядам. Увогуле і па зместу, і па афармленню яны відавочна адстаюць ад запатрабаванняў і густаў чытачоў, і магутным рычагом публічнасці і дэмакратыі, рухаючым справу абнаўлення жыцця, яны яшчэ не сталі. (А, па даўняй і слушнай сёння заўвазе Леніна, газета, якая адстае,— загінула.)

Але трэба думаць не аб тым, як бы ліквідаваць «раёнкі»: само ж узнікненне іх знамянуе палітычную і культурную заваёву сацыялістычнага ладу. І не аб тым, як бы замяніць іх зменнымі палосамі для асобных раёнаў у абласных газетах: апошнія не змогуць удзяляць кожнаму рэгіёну дастаткова месца для ўсебаковага асвятлення яго дынамікі і ажыццяўлення самабытных мэт. І нават не аб тым, як бы аб'яднаць іх у міжраённыя — органы некалькіх райкомаў і райвыканкомаў: такое ўжо

было ў некаторых рэспубліках і абласцях (1962 год), але не апраўдала сябе — панізілася цікавасць чытача. (На жаль, і цяпер знаходзяцца «рэвалюцыянеры-перабудоўшчыкі» з падобнымі намерамі). Розум і вопыт падказваюць: трэба думаць аб тым, у якім напрамку паляпшаць «раёнкі»,— з тым, каб яны адпавядалі запатрабаванням «нізоў», а таксама актыўна садзейнічалі якасна новаму ўздыму краіны.

*А. І. НАРКЕВІЧ*

## МОВАЗНАЎЧЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ: ТЭАРЭТЫЧНАЯ І ПРАКТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ, САМАСТОЙНАЯ РАБОТА

Пытанні метадалагічных асноў навучання, адзінства тэарэтычнай і практычнай накіраванасці ў выкладанні вучэбных дысцыплін заўсёды былі і застаюцца надзвычай важнымі і актуальнымі. Гэта датычыць не толькі грамадазнаўчых, спецыяльных журналісцкіх, але і моўных дысцыплін.

На факультэце журналістыкі ў адпаведнасці з вучэбным планам чытаюцца курсы сучаснай рускай і сучаснай беларускай мовы, разлічаныя на першы і другі гады навучання студэнтаў. На трэцім і чацвёртым курсах выкладаецца практычная і функцыянальная стылістыка. Разам з тым праводзяцца планавыя кантрольныя і курсавыя работы па стылістыцы рускай і беларускай моў, некаторыя з якіх перарастаюць у дыпломныя.

На філалагічным факультэце, лінгвістычныя дысцыпліны на якім (побач з літаратуразнаўчымі) з'яўляюцца прафілюючымі, апрача курсаў сучаснай мовы, чытаецца дадаткова цэлы цыкл вузкаспецыяльных мовазнаўчых дысцыплін, якія пры ўсёй іх адметнасці і спецыфічнасці маюць усё ж непасрэдныя адносіны і да нашых курсаў і непарыўна звязаны з імі. Без лінгвістычных даных гэтых дысцыплін, у прыватнасці «Уводзін у мовазнаўства» і «Агульнага мовазнаўства», не абыйсціся. Таму ў нашы курсы неабходны як бы «ўкрапванні», «укліньванні» элементаў вучэння гэтых галін лінгвістыкі, у якіх выкладаюцца важнейшыя метадалагічныя палажэнні і ўстаноўкі, пытанні тэорыі і практыкі сучаснай лінгвістычнай навукі.

Гэтак жа неабходныя для нашых курсаў сувязі з гісторыяй мовы, гістарычнай граматыкай і лексікалогіяй, гісторыяй літаратурных моў, дыялекталогіяй, параўнальным мовазнаўствам. А таму існуе патрэба ва ўвядзенні дысцыплін спецыялізацыі, сістэмы спецкурсаў і спецсемінараў, ва ўдасканальванні працэсаў навучання, разнастайванні форм і метадаў заняткаў, разгортванні метадычнай работы.

Прыступаючы да выкладання курса, ужо ў самым пачатку неабходна асвятліць тэарэтычныя праблемы, якія датычаць пытанняў сутнасці мовы як грамадскай з'явы, паколькі ў гісторыі мовазнаўства існавалі розныя погляды на яе прыроду, ролю мовы і прызначэнне. Ды і ў сучаснай зарубежнай лінгвістыцы гэтыя пытанні вырашаюцца неадназначна. Наша ж задача — выпрацаваць у студэнтаў матэрыялістычнае разуменне сутнасці моўных з'яў, іх эвалюцыі і дынамікі развіцця.

Гэтак жа неабходна раскрыць сутнасць марксісцка-ленінскай тэорыі аб паходжанні мовы, ролі працы ў яе ўзнікненні і развіцці. Праца і толькі праца, неабходнасць сказаць, звярнуцца адзін да аднаго, абмяняцца думкамі з'явіліся першаасновай і галоўнай умовай паяўлення мовы. Разам з тым, паказваецца негрунтоўнасць іншых тэорый і вучэнняў аб паходжанні мовы — біялагічнай, згодна з якой мова ў любым месцы і ў любы час развіваецца па законах прыроды падобна іншым жывым арганізмам (жывёлам, раслінам), ідэалістычных па сваёй сутнасці тэорый гукапераймання, сацыяльнага дагавору, працоўных выгукаў і інш.